фа ў г. Валожын, 1816), капліц (*Маладаўская капліца*, 1905—1908), палацаў (*Валожынскі палац*, 1806; *Дзярэчынскі палац*, 1786, перабудаваны ў пач. 19 ст.; *Лапушненскі палац*, 19 ст.; *Маладаўскі палац*, 1798), сядзіб (*Обальская сядзіба*, 1-я пал. 19 ст.), радзей — грамадскіх будынкаў (*Гродзенская ратуша* з гандлёвымі радамі, 1807; будынак Бел. с.-г. акадэміі ў г. Горкі, 1837).

*Ю.Ю.Захарына.*

**ДАРЭННЕ**, абрад, якім прасякнуты амаль усе этапы вяселля. Спецыфіка Д. вызначаецца лакальнымі асаблівасцямі і не дазваляе вылучыць якое-небудзь універсальнае, агульнае падабенства для кожнай традыцыі. Ужо на малых заручынах маці дзяўчыны брала локаць ці 2 даматканага палатна, абкручвала ім пляшку і аддавала свату. На вял. запоінах сват дарыў маладым пірог з макам і мёдам, сыр, смажанае мяса, грошы. Пры гэтым спявалі: «Ото ж табе, Васілька, // Увядзёна Агатка. // Калі яе любіш — дай пірог, // Калі не любіш, то вон за парог...» У песнях пачатковага этапу вяселля паведамлялася, як маладая задоўга да свята рыхтавала падарункі «не за дзень іх выпрала, не за два дні выткала». Іх трэба было падарыць усёй радні жаніха: «Свёкру, як бацьку, а свякрові, як матцы, а дзевяратку, як братку, а залавіцы, як сястрыцы». У час заручын сват дарыў маладой чаравічкі, якія яна прымала, у адпаведнасці з традыцыяй, толькі пасля трох разоў Д. Маладая ў сваю чаргу адорвала яго кружэльным (льняным) ручніком, што сімвалізавала ўладу (Пружаншчына). Жаніх і нявеста абменьваліся падарункамі перад уступленнем у шлюб. Пры абдорванні маладых у песнях услаўляліся іх працавітасць, майстэрства, асабліва нявесты («Казалі, Машачка не ткаха»). Яна «раненька ўставала», «таненька ўпрадала», «бяленька бяліла», шмат падарункаў нарабіла і «ўсіх абдарыла». Жаніх дарыў нявесце чорныя чаравічкі, белыя панчошкі, залаты кубак, залаты пярсцёнак: «Першы падарак — пярсцёнак, другі падарак — вяночак, трэці падарак — конь вараны, чацвёрты падарак — сам малады». Асабліва ўрачыстым і ўзнёслым было Д. маладых у час падзелу каравая. Іх адорвалі адзеннем, палатном, грашыма і жывёлай. Калі дарыў брат, маладая, плачучы, дзякавала: «Да мой брахненька, // Дзякую табе за дары вялікія твае. // Калі жыва буду да спамагуся. // Табе адгаджуся; // А калі не табе, // То дзеткам тваім». Бацькі звычайна дарылі грошы і інш. падарункі або проста паведамлялі, што дораць. Пры гэтым давалі наказы маладым, каб яны паважалі старэйшых, не ганьбілі імя роду: «Дарую шчасце і долю // І стары куст, // Каб не быў двор пуст, // Каб друг друга цалавалі // І старога не пакідалі». Часам пры дарэнні маладых гучала: «Дорым калыску і жадаем, // Каб да гадочка // Бог даў сыночка, // А на другі — дочку». Не абыходзілася і без жартаў: «Дару дугою, // Каб не хадзіў за другою». Маладая давала падарункі бацькам маладога, яго братам, сёстрам, а таксама музыкантам. Сёння ў час дзяльбы караваю Д. ператвараецца ў тэатралізацыю, маленькі спектакль, на якім, акрамя ўручэння падарункаў маладым, чытаюць вершы, спяваюць віншавальныя песні, танцуюць, выконваюць рацэі, зычэнні і інш.

*А.М.Аляхновіч.*

**ДАСАЕВА** Таццяна Мікалаеўна (н. 27.7.1951, в. Знамя Слуцкага р-на), беларускі літаратуразнавец, крытык. Д-р філал. навук (2003). Скончыла БДУ (1973). Настаўнічала. З 1977 у Ін-це л-ры НАН Беларусі, з 1998 у Ін-це журналістыкі БДУ (з 2003 заг. кафедры). Даследуе бел. прозу 1920—30-х гг., сучасны літ. працэс. Аўтар кніг: «Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага», «Пошукі героя: З вопыту беларускай прозы 20-х гг.» (абедзве 1993), «Паэтыка лірызму ў беларускай публіцыстыцы і мастацкай прозе» (2001), «Максім Гарэцкі і Янка Брыль: тыпалогія малых жанраў» (2004). Укладальнік і аўтар каментарыя да 2-га і 7-га т. Збору твораў І.Мележа ў 10 т. (1979—85).

**ДАСТАЕЎСКІ** Фёдар Міхайлавіч (11.11.1821, Масква — 9.2.1881), рускі пісьменнік. Карані Д. непарыўна звязаны з Беларуссю, яго продкі доўгі час жылі ў маёнтку Дастоева (цяпер вёска ў Іванаўскім р-не). Скончыў Гал. інжынернае вучылішча ў Пецярбургу (1843). Друкаваўся з 1844. Вядомасць прынёс першы раман «Бедныя людзі» (1846). У творах Д. распрацаваў своеасаблівы тып філас. псіхал. заглыбленага рэалізму, звернутага да пазнання складанай і супярэчлівай свядомасці чалавека. Захапляўся гуманіст. ідэямі В.Р.Бялінскага і эстэтыкай «натуральнай школы» («Двайнік», 1846; «Белыя ночы», 1848; «Нетачка Нязванава», 1849 і інш.). Свае погляды Д. змяніў пасля арышту ў 1849 і ссылкі (1850—59), ён звярнуўся да ідэй хрысціянскага гуманізму («Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары», «Дзядзечкаў сон», абодва 1859; «Запіскі з мёртвага дома», 1861—62). На думку пісьменніка, ідэя пакут, якая жыве ў сэрцы народа, вызначае своеасаблівы шлях Расіі да «зямнога раю» («Прыніжаныя і зняважаныя», 1861; «Запіскі з падполля», 1864; «Зімовыя нататкі пра летнія ўражанні», 1864). У 1870-я гг. Д. развівае ў сваёй творчасці гуманіст. ідэі. Яго героі праходзяць іспыты воляй. Чалавек, на думку пісьменніка, мае «здольнасць да ўсяго і ў ліху, і ў дабрыні». Чалавек «у ліху» адлюстраваны ў «Злачынстве і кары» (1866), «Д'яблах» (1871—72), «Падлетку» (1874—75). У рамане «Ідыёт» (1868) аўтар імкнецца паказаць «цалкам цудоўнага чалавека». Пра шляхі чалавечай душы ад бездані падзення праз прасвятленне пакутамі да адраджэння расказвае Д. ў рамане «Браты Карамазавы» (1879—80). Паліт. і філас. погляды пісьменніка знайшлі адлюстраванне ў штомесячным выданні «Дзённік пісьменніка» (1873—81).

У бел. л-ры ўплыў і развіццё маст. ідэй Д. праявіліся ў творчасці М.Гарэцкага (драма «Антон»), М.Зарэцкага («Сцежкі-дарожкі»), К.Чорнага і інш. У творах В.Быкава і В.Казько прасочваецца вопыт вывучэн-